і немэтазгоднае ўсярэдненне навучэнцаў і з'яўляецца магчымасць для кожнага навучацца на ўзроўні яго наяўнага патэнцыялу і здольнасцяў. Навучэнцы атрымліваюць індывідуальныя заданні, якія адпавядаюць іх узроўню падрыхтоўкі, але ў іх маюцца магчымасці для далейшага інтэлектуальнага росту.

Адной з важных умоў дасягнення мэтаў на семінарскіх занятках з'яўляецца развіццё разумовай дзейнасці навучэнцаў, у прыватнасці выкарыстанне метаду праблемнага навучання. Ён спрыяе творчаму мысленню навучэнцаў, іх індывідуальнаму развіццю. Праблемнае навучанне ўключае ў сябе стварэнне праблемных сітуацый, якія навучэнцы павінны вырашыць, зыходзячы з уласных ведаў і жыццёвага вопыту. Выкарыстанне дадзенай тэхналогіі дапамагае авалодаць абагульненым спосабам падыходу да вырашэння праблемных сітуацый: аналізам фактаў, вылучэннем гіпотэз для іх тлумачэння, праверкай іх правільнасці і атрыманнем выніку дзейнасці.

Адным з перспектыўных кірункаў у працэсе навучання і арганізацыі самастойнай працы навучэнцаў з'яўляецца тэхналогія праектнага навучання, у межах якой выкладчык стымулюе іх актыўнасць, яны вучацца самастойна атрымліваць веды з розных крыніц, развіваюць навыкі аналітычнага, крытычнага і творчага мыслення.

Аднак укараненне найноўшых інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у адукацыю патрабуе паглыбленага аналізу пераваг і недахопаў выкарыстання мультымедыйных комплексаў у навучальным працэсе. У галіне гуманітарных ведаў укараненне такіх навацый патрабуе асцярожнасці і прадуманасці, паколькі засваенне гуманітарных ведаў і выкладанне гуманітарных дысцыплін маюць сваю спецыфіку. У дадзеным выпадку не заўсёды маецца станоўчы вынік ад прымянення тэхнічных і тэхналагічных сродкаў у працэсе адукацыі з пункту гледжання выхаваўчага эфекту, таму іх варта выкарыстоўваць як дадатковы сродак адукацыі разам з традыцыйнымі метадамі і прыёмамі.

Акрамя таго, укараненне такіх тэхналогій спалучана з шэрагам цяжкасцяў: недастатковымі фінансавымі магчымасцямі многіх навучальных устаноў, цяжкасцямі ў перабудове іх арганізацыйных, адукацыйных і эканамічных працэсаў, кансерватызмам некаторых чыноўнікаў у адукацыйнай сферы і часткі педагогаў, недастатковым развіццём тэхналогій. Нягледзячы на відавочную неабходнасць у інавацыях, усё ж укараняць і выкарыстоўваць іх варта з асцярожнасцю. Неасцярожная інавацыйная дзейнасць можа прывесці да крызісу адукацыйнай сістэмы ўвогуле.



УДК 378.635

***А.М. Сувалаў****, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

## ФАРМІРАВАННЕ ЎСТАНОЎКІ НА САМАСТОЙНАЕ НАВУЧАННЕ Ў КУРСАНТАЎ ПЕРШЫХ КУРСАЎ АКАДЭМІІ МУС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Першыя курсы навучання з пункту гледжання атрымання вышэйшай адукацыі маюць вызначальнае значэнне ў фарміраванні ўстаноўкі на самастойную інтэнсіўную працу навучэнца. Выработка кампетэнцый, напрацоўка курсантам уменняў і навыкаў самастойнай працы не толькі з'яўляюцца абавязковай умовай паспяховага навучання яго ва ўстанове вышэйшай адукацыі, але і выступае ў якасці гарантыі таго, што пасля заканчэння навучання выпускнік будзе здатны для пастаяннай рэфлексіі і самаадукацыі. Ён будзе мець магчымасць ва ўмовах сучасных патрабаванняў пастаянна аднаўляць раней атрыманыя і пры неабходнасці набываць ці выпрацоўваць новыя прафесійныя кампетэнцыі.

Аб'ёмы паступаючай інфармацыі і дынаміка развіцця сучасных тэхналогій патрабуюць ад вышэйшай школы падрыхтоўкі не вузкапрофільнага спецыяліста, які валодае абмежаваным прафесійным наборам пэўных кампетэнцый, а прафесіянала, які перш за ўсё здатны адэкватна ацэньваць свой узровень прафесійнай падрыхтоўкі, бачыць перспектыўныя кірункі самаразвіцця, мець неабходныя навыкі і ўменні для самаадукацыі і павышэння сваёй прафесійнай кваліфікацыі.

Зыходзячы з абазначанага вышэй пасыла, можна сцвярджаць, што галоўнай метадалагічнай устаноўкай выкладчыка, які працуе на першых курсах, павінна стаць імкненне стварыць такія ўмовы для працы курсанта, якія б у найбольшай ступені спрыялі фарміраванню ў яго ўстойлівага пераканання аб тым, што атрыманне ведаў, выпрацоўка ўменняў і навыкаў, фарміраванне кампетэнцый з'яўляюцца вызначальнымі для яго асабістага развіцця, станаўлення яго як спецыяліста і прафесіянала. У гэтай сувязі важна, каб матывацыя да вучобы не стымулявалася бояззю негатыўных наступстваў у выглядзе нездавальняючых адзнак ці іншых падобнага роду праблем (пазбаўленне права на кароткатэрміновае звальненне, водпуск ці права на старэйшых курсах пражываць па-за казармай і г. д.). Найбольш прадукцыйным у гэтым плане ўяўляецца выкарыстанне пазітыўных установак на вучобу, стымуляванне да самаадукацыі праз



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

перакананне навучэнца ў тым, што ён як чалавек, які атрымлівае вышэйшую юрыдычную адукацыю, у першую чаргу павінен навучыцца вучыцца. Мэтанакіравана праз кожны занятак з навучэнцам яму трэба даводзіць і паказваць, што, набыўшы навыкі і ўменні самастойнай працы, любы чалавек мае кампетэнцыі для таго, каб быць здатным разабрацца ў любой, нават надзвычай складанай праблеме, паколькі валодае неабходнай методыкай і ведае, дзе здабыць патрэбныя для рашэння праблемы даныя. Навучэнец павінен у максімальна кароткія тэрміны пазбавіцца ад «школьнага» стаўлення да навучання, усвядоміць, што добрая памяць і ўменне максімальна поўна перадаць матэрыял патрэбнага параграфа ці раздзела ўжо недастаткова для ўзроўню вышэйшай адукацыі. Неабходна фарміраваць уяўленне, што паспяховае засваенне вучэбнай дысцыпліны – гэта асабісты інтарэс самаго навучэнца, што знешні матыватар у выглядзе адзнак па вучэбнай дысцыпліне не павінен стаць адзіным і галоўным пасылам навучання.

Такім чынам, галоўнай і краевугольнай метадалагічны задачай, што стаіць перад выкладчыкам, які працуе на першых курсах установы вышэйшай адукацыі, з'яўляецца фарміраванне ў навучэнца ўстаноўкі на самастойнае засваенне ведаў, выпрацоўку навыкаў і ўменняў і на іх аснове – выпрацоўку прафесійных кампетэнцый як працэс асабістага самаўдасканалення. У гэтай сувязі істотна давесці да свядомасці навучэнца, што лекцыі, семінары і практычныя заняткі – гэта знешнія формы праяўлення навучання. Важнам дадаткам да гэтага выступае фарміраванне разумення таго, што навучанне – гэта заўсёды самаадукацыя і саманавучанне, што яно не абмяжоўваецца толькі заняткамі па вучэбнаму плану і вучэбнаму раскладу з выкладчыкамі і, што самае галоўнае, не зводзіцца толькі да выканання патрабаванняў, закладзеных праграмай вучэбнай дысцыпліны і асабістымі патрабаваннямі пэўнага выкладчыка.

Адным з найбольш дзейсных метадаў дасягнення ўказаных установак з'яўляецца, на наш погляд, самастойная творчая праца навучэнца па пэўнай і, што асабліва істотна, самастойна ім абранай навуковай тэме. Самастойнасць выбару тэмы псіхалагічна не дазваляе навучэнцу фармальна яе адпрацаваць. Калі тэма сапраўды «кранае», то складваецца тая неабходная сітуацыя, калі працэс працы над тэмай перастае быць абавязкам, невыкананне якога будзе мець негатыўныя наступствы. Тут пачынаюць спрацоўваць фактары пазітыўнага характару: мне цікава, я магу разабрацца ў складанай праблеме, я выяўляю і фармулюю навуковыя заканамернасці і г. д. Так, нават рэальна не стварыўшы сур'ёзнай навуковай працы (трэба памятаць, што гэта ўсё ж такі першыя курсы),



навучэнец набывае навыкі працы з крыніцамі, вучыцца працаваць з навуковай літаратурай, фармуляваць і даводзіць сваю пазіцыю. Інакш кажучы, ён пры такой форме работы набывае першасныя навыкі самастойнай працы і самаадукацыі. Пры гэтым на маладога чалавека не давіць фактар абавязковасці, а пазітыўна ўздзейнічаюць матывы свабоды выбару тэмы, кірунку даследавання, самастойнасці пры фармуляванні вынікаў. Пачынае фарміравацца перакананне ў сваіх магчымасцях і здатнасці да самастойнага вырашэння праблем.

Вынікам падобнага ўздзеяння на навучэнца павінны стаць фарміраванне і выпрацоўка ў яго ўстойлівага пераканання, што навучанне чалавека павінна працягвацца ўсё жыцце, што яго цяперашні стан (навучанне ва ўстанове вышэйшай адукацыі) – самы выгадны з пункту гледжання наяўных умоў перыяд для інтэнсіўнай працы над сабой, атрымання і назапашвання ведаў, фарміравання прафесійных кампетэнцый.

УДК 378.635

***О.Э. Схопчик****, старший преподаватель кафедры психологии и педагогики Академии МВД Республики Беларусь, кандидат психологических наук*

## ВОЗМОЖНОСТИ ТРЕНИНГОВЫХ МЕТОДОВ В РАЗВИТИИ ЦЕННОСТНО-ЦЕЛЕВОЙ ОРИЕНТАЦИИ И МОТИВАЦИИ КУРСАНТОВ

Профессиональная подготовка будущих сотрудников ОВД предполагает не только формирование системы профессиональных знаний, умений и навыков, но и целенаправленное развитие личности с безупречными моральными качествами и культурой, чувством ответственности и преданностью интересам службы.

Становление профессионала с высокими нравственными качествами требует формирования мировоззрения и самосознания личности будущего сотрудника ОВД. Такое формирование предусматривает развитие ценностно-целевой ориентации и мотивации личности.

Ценностно-целевая ориентация и мотивация проявляются в понимании важности профессионального долга, стремлении защищать правопорядок. Их развитие требует целенаправленного формирования ценностного отношения к профессиональной деятельности, устойчивых положительных мотивов учебы и службы, определяющих долго-



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com